форма. Трэба было б Вам пайсьці па сьлядох Украіны, згладзіўшы крыху асабліва вострыя канты. Трэба знайсьці „залатую сярэдзіну“ між жаданьнямі народных мас і вымаганьнямі палітычнае кан'юнктуры. Далейшыя яркія сацыяльныя выступленьня могуць Вам прыдбаць папулярнасьць у народных масах, але разам з тым могуць разьбіць наша дзяржаўнае будаўніцтва і вярнуць нас у межы Расейскай дзяржавы.

Мы верым, што Вы здалееце ўдачна разьвязаць гэту бясспорна цяжкую задачу і жычым Вам сіл і энэргіі дзеля яе. Напамінаем яшчэ раз, што periculum in mora![3]

*Прэзыдыюм Беларускай Рады.*

## Аб даўгі Расеі

Аддзяленьне ад Расейскай дзяржавы зямель, каторыя былі некалі паняволены ею і цяпер адна за аднэй здабываюць сабе ізноў незалежны быт, стаўляе на чародзе пытаньне: як будзе з выплатай даўгоў, каторыя Расея зрабіла на вядзеньне вайны, выступаючы ад імя ўсіх прыслухаючых ей народаў.

Ясна тут адно: што ніводзін народ і ніводзін край, вызваліўшыся цяпер з–пад расейскага панаваньня, ня лічыць сябе абязаным адказваць за даўгі няволіўшай іх дзяржавы. У прынцыпе з гэтым згаджаецца нават і сама Расея. У Брэсцкім трактаце ясна гаворыцца, што для зямель, уступленых Расеяй, не вынікаюць ніякія павіннасьці з прычыны іх ранейшае прыналежнасьці да Расейскае дзяржавы. А раз гэта прызнаецца ў адносінах да ўступленых расейцамі тэрыторый, дык трэба прызнаць і ў адносінах да тых зямель і народаў, каторыя самі апавясьцілі аддзяленьне сваё ад Расеі.

Паскольку заходняя часьць Беларусі, ад каторай Расея ў Бярэсьці адраклася, гэтым самым аказалася звольненай ад усіх расейскіх даўгоў, пастольку Ўсходняя Беларусь, абвяшчаючы сваю незалежнасьць, сама звольніла сябе ад павіннасьці плаціць даўгі Расеі, каторых на ўсю Беларусь (паводлуг падрахунку, каторага мы ня мелі магчымасьці праверыць) прыпадае каля 7 мільярдаў.

Аднак проці прызнаванага Расеяй прынцыпа выступаюць тыя дзяржавы, каторыя ад пачатку вайны напазычалі Расеі шмат грошы. Гэтак, англіцкі і францускі ўрады апавяшчаюць, што „грашовыя абавязацельствы расейскага ўраду павінны ўдзяржаць сваю моц. Яны абавязваюць або будуць абавязваць новыя дзяржавы, эвэнтуальна — комплекс новых дзяржаў, якія маюць у будучыні замяніць Расею“.

Крыху іначай стаўляе гэту справу Японія. Ей ніякага дзела няма да таго, як Расея разьвязвае пытаньне аб выплаце даўгоў. Як выявілася, апавешчанае выступленьне Японіі ў Сыбіры ня мела ані палітычных, ані ваенных мэт. Усе гутаркі францускіх газэт аб прычынах японскага выступленьня аказаліся зусім пустымі: Японія не зьбіраецца ані грозіць немцам з усходу, ані прашкодзіць ім скарыстаць з запасаў збожжа ў Сыбіры, а толькі хоча мець залог за расейскія даўгі, якіх сучасны ўрад наагул не зьбіраецца плаціць.

Як бы там ні было, мы бачым, што Англія і Францыя — гэта натуральныя ворагі вызваленьня з–пад Расеі паняволеных ею народаў, бо гэта грозіць інтарэсам англіцкага і францускага капіталізму, аслабляючы выплатную сілу Расейскай дзяржавы. Аб гэтым павінны добра падумаць тыя, хто ўсе свае надзеі дагэтуль ускладаў на саюзныя з Расеяй дзяржавы...